**ФАРМІРАВАННЕ РЭГІЯНАЛЬНАГА КАМПАНЕНТА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ**

*В.І.Саітава*,
дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
кандыдат педагагічных навук

*А.В.Прадзеіна*,
дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
кандыдат педагагічных навук

Бібліятэкі актыўна ўдзельнічаюць у фарміраванні сучаснай інфармацыйнай прасторы і ўносяць важкі ўклад у забеспячэнне неабмежаванага доступу да інфармацыі, садзейнічанне размеркаванню рэсурсаў, удасканаленню доступу да электроннага кантэнту, паслуг і інструментарыя. Бібліятэкі розных тыпаў і відаў імкнуцца прадставіць у сусветнай, нацыянальнай і рэгіянальнай прасторы свае ўласныя рэсурсы. У апошнія дзесяцігоддзі праблема належнага адлюстравання нацыянальнай і рэгіянальнай дакументальнай спадчыны набыла асаблівую актуальнасць у Беларусі. Вядучая роля сярод бібліятэк у яе рэалізацыі належыць Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (далей – НББ), якая ўзначальвае такія буйнейшыя праекты, як фарміраванне Нацыянальнай электроннай бібліятэкі (далей – НЭББ), нацыянальнай бібліяграфіі, Зводнага электроннага каталога бібліятэк Беларусі і інш. Так, у межах НЭББ на сённяшні дзень створаны 16 паўнатэкставых калекцый электронных копій дакументаў, асабліва важных у вывучэнні беларускай гісторыі і культуры. Сярод іх электронныя калекцыі: «Крыніцы па гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.», «Перыядычны друк Беларусі другой паловы XVIII ст. – 1917 г.», «Знакамітыя імёны і падзеі Беларусі» і інш., у якіх прадстаўлены каштоўныя і рэдкія дакументальныя крыніцы рэгіянальнага паходжання. Помнікі рэгіянальнай дакументальнай спадчыны краіны прадстаўлены і ў міжнародных праектах: «Золотая коллекция Евразии» і інш. Такім чынам, НББ уводзіць у сусветную, нацыянальную і рэгіянальную інфармацыйную прастору важнейшую частку рэгіянальнай дакументальнай спадчыны [3].

Але галоўная роля ў прадстаўленні рэгіянальнай дакументальнай спадчыны ў нацыянальнай і глабальнай інфармацыйнай прасторы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

належыць абласным бібліятэкам як інфармацыйным і каардынацыйным цэнтрам у галіне краязнаўства ў рэгіёне.

Фарміраванне рэгіянальнай інфармацыйнай прасторы як кампанента нацыянальнай сістэмы – адказная задача абласных бібліятэк. Яе асноўным кірункам будзе ўзаемадзеянне абласных бібліятэк з НББ, публічнымі бібліятэкамі, бібліятэкамі ВНУ, музеяў і інш. Інавацыйнай формай работы стала прадстаўленне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў абласных бібліятэк праз віртуальную чытальную залу НББ [5]. Але для пабудовы адзінай інфармацыйнай прасторы рэгіёна трэба вырашаць пытанні супрацоўніцтва паміж бібліятэкамі і з іншымі ўстановамі рознай ведамаснай прыналежнасці. Некаторыя праекты патрабуюць міжнароднага супрацоўніцтва. Напрыклад, рэалізацыя праекта «Віртуальная рэканструкцыя спадчыны Ю.І.Крашэўскага», над якім працуюць Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага, НББ, Ровенская дзяржаўная абласная бібліятэка (Украіна), Бялападляская гарадская публічная бібліятэка і музей-сядзіба Ю. Крашэўскага (Раманава, Польшча), дазволіць прадставіць у алічбаванай форме багацейшую літаратурную спадчыну знакамітага ўраджэнца Брэсцкага краю і стварыць інтэграваны бібліяграфічны рэсурс для арыентацыі ў дакументальным масіве, звязаным з яго імем. Усё гэта дазволіць актуалізаваць імя Ю. Крашэўскага ў навуковым, адукацыйным і асветніцкім працэсах, забяспечыць даступнасць да створаных рэсурсаў шырокіх колаў карыстальнікаў [1].

Дакументальная спадчына рэгіёнаў Беларусі патрабуе скрупулёзнага выяўлення, камплектавання (дакамлектавання), арганізацыі шырокага доступу да яе розных катэгорый карыстальнікаў. Перспектыўным кірункам з'яўляецца стварэнне лічбавых копій каштоўных дакументальных крыніц. Алічбаванне выбранай часткі рэгіянальных інфармацыйных рэсурсаў патрабуе абгрунтаванага падыходу, вызначэння іх складу, распрацоўкі інфармацыйнага партала і інш. У прыватнасці, бясспрэчна запатрабаваным з’яўляецца выяўленне і алічбаванне мясцовага перыядычнага друку, у тым ліку газет даваеннага і пасляваеннага перыядаў. На жаль, алічбаванне рэгіянальных дакументальных рэсурсаў яшчэ нязначнае ў абласных бібліятэках.

Істотнае значэнне для фарміравання рэгіянальнай інфармацыйнай прасторы маюць распрацоўка зводных планаў камплектавання краязнаўчых фондаў рэгіёна і зводных інфарма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйных рэсурсаў па краязнаўстве, прадстаўленне краязнаўчых бібліятэчных сэрвісаў і інш. Для дзейнасці ў дадзеным кірунку створаны спрыяльныя ўмовы. Так, у выніку рэалізацыі галіновых праграм «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.», Праграмы інфарматызацыі галіны культуры на перыяд да 2010 г. працягваецца аўтаматызацыя бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

Бібліяграфічнае прадстаўленне рэгіянальных дакументальных рэсурсаў у нацыянальнай інфармацыйнай прасторы патрабуе прымянення сучасных стандартаў і сумяшчальнага праграмнага забеспячэння.

Выкарыстанне нацыянальных камунікатыўнах форматаў Belmarc па стварэнні бібліяграфічных і аўтарытэтных/нарматыўных запісаў стварыла аснову для фарміравання нацыянальнай сістэмы карпарытыўнай каталагізацыі і зводнага электроннага каталога бібліятэк Беларусі. Дасягненнем абласных бібліятэк краіны з’яўляецца прадстаўленне ў Інтэрнэт краязнаўчых баз даных у складзе электронных каталогаў. Краязнаўчыя электронныя каталогі як буйнейшы бібліяграфічны рэсурс забяспечваюць упарадкаванне разнастайных дакументаў, прысвечаных рэгіёнам, і іх пошук па аўтарах, назвах, геаграфічных аб’ектах, ключавых словах і іншых прыметах.

Рэальны шлях стварэння бібліяграфічнага рэпертуару мясцовых дакументаў, як часткі рэгіянальнай і нацыянальнай інфармацыйнай прасторы, бачыцца ў сувязі з распрацоўкай электроннага інфармацыйнага рэсурсу «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі», заданне па стварэнні якога ўвайшло ў Дзяржаўную праграму «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг. [2].

У рамках стварэння дадзенага рэсурсу, які з’яўляецца важнай часткай бібліяграфічнага рэпертуару нацыянальнага дакумента, дзяржаўнай бібліяграфіі [4], абласныя бібліятэкі павінны выступіць у ролі рэгіянальных цэнтраў каталагізацыі і бібліяграфіі мясцовага друку, мэтай якіх будзе прадстаўленне максімальна поўнай бягучай і рэтраспектыўнай бібліяграфічнай інфармацыі аб мясцовых дакументах.

Перспектыўным доўгатэрміновым кірункам, на наш погляд, з’уляецца фарміраванне зводных краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў, у тым ліку бібліяграфічных, і прадстаўленне ў Інтэрнэт – зводных каталогаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў, створаных з удзелам бібліятэчных сістэм

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(у тым ліку ЦБС), бібліятэк вышэйшых навучальных установ, краязнаўчых музеяў і інш.; фарміраванне і забеспячэнне доступу (праз Інтэрнэт ці лакальна) да паўнатэкставых, камбінаваных і іншых электронных інфармацыйных рэсурсаў уласнай генерацыі.

У абласных бібліятэках расце колькасць электронных бібліяграфічных дапаможнікаў, ініцыяваны цікавыя і важныя праекты па стварэнні фактаграфічных, паўнатэкставых і камбінаваных баз даных, прысвечаных абласцям. Стварэнню камбінаваных баз даных, на наш погляд, будзе садзейнічаць укараненне ў практыку работы бібліятэчных сістэм краіны праграмнага прадукту «Памяць рэгіёна», створанага НВФ «INEAK» [5].

Да найважнейшых праблем дзейнасці абласных бібліятэк, якія патрабуюць новых падыходаў, належыць удасканаленне інфармацыйна-пошукавых сістэм па краязнаўстве: падрыхтоўка і забеспячэнне доступу да электронных інфармацыйных рэсурсаў уласнай генерацыі, у тым ліку створаных на карпаратыўнай аснове, удасканаленне доступу да электронных рэсурсаў, прысвечаных рэгіёну, у прасторы Інтэрнэт.

У сувязі з укараненнем новага праграмнага забеспячэння «ALIS-web» (сумяшчальнага з фарматам Belmarc) для стварэння бібліяграфічных інфармацыйных рэсурсаў, у тым ліку і па краязнаўстве, актуальным з’яўляецца вырашэнне праблемы стварэння якаснага краязнаўчага інфармацыйнага прадукту. Патрабуе хуткага вырашэння дапрацоўка магчымасці стварэння бібліяграфічнага запісу на частку дакумента з аднатомных і шматтомных кніг, выданняў, якія працягваюцца, што можа быць прадстаўлена главой, раздзелам, параграфам, фрагментам тэксту і г.д. Важнасць гэтай работы абумоўлена значнай колькасцю краязнаўчых дакументаў, якія прадстаўлены аналітычным матэрыялам. Вырашэння патрабуюць пытанні фарміравання краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў (тыпу «Новая літаратура аб … вобласці (раёне, горадзе, мястэчку і інш.)»), якія на бягучы момант немагчыма ствараць з-за недапрацаванасці праграмнага забеспячэння; удзелу абласных бібліятэк у фарміраванні аўтарэтытных запісаў; удасканалення пошукавага вобразу краязнаўчых дакументаў; афармлення бібліяграфічнага запісу на краязнаўчы дакумент і інш.

Неабходна каардынацыя работы абласных бібліятэк, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і распрацоўшчыкаў праграмнага забеспячэння для вырашэння агульных падыходаў да стварэння бібліяграфічнай інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кожны з закранутых напрамкаў фарміравання рэгіянальнага кампанента нацыянальнай інфармацыйнай прасторы бібліятэкамі садзейнічае захаванню, актуалізацыі і шырокаму выкарыстанню рэгіянальнай дакументальнай спадчыны краіны.

______________

1. *Брестская* областная библиотека им. М. Горького [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://brl.by/.

2. *Дзяржаўная* праграма «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады: зацв. пастановай Савета Міністраў Рэсп. Беларусь ад 26.12.2010 № 1905 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.pravo.by/webnpa/text.asp? RN = C21001905.

3. *Интернет-портал* Национальной библиотеки Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://portal.nlb.by/.

4. *Шатохина, Н. З.* Краеведческие библиографические ресурсы региона: состояние, перспективы развития: автореф. дис. … канд. пед. наук: 05.25.03 / Н. З. Шатохина; Орловский гос. ин-т искусств и культуры. – М., 2009. – 21 с.

5. *Шышкін, У*. Бібліятэчныя ўстановы: вынікі дзейнасці бібліятэк краіны ў 2010 г. / У. Шышкін // Бібліятэчны свет. – 2011. – №2. – С. 5–6.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ